Мацук, А. У. Польская гістарыяграфія ўнутрыпалітычнага становішча ў ВКЛ (1717—1763 гг.) / А. У. Мацук // Российские и славянские исследования: науч. сб. / Белорус. гос. ун–т.; А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск, 2008. – Вып.3. – С. 205–216.

**А. У. Мацук**

# ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНАГА СТАНОВІШЧА Ў ВКЛ (1717—1763 гг.)

Гістарыяграфія гісторыі ВКЛ XVIII ст. не такая шырокая, як папярэдніх ці наступных перыядаў, а пытанне палітычнай арганізацыі жыцця ў ВКЛ у гэты перыяд амаль зусім аказалася па-за ўвагай даследчыкаў. Такое становішча, на наш погляд, ёсць наступствам не столькі навуковых, колькі палітычных прычын. XVIII ст. — час актыўнага ўмяшальніцтва ва ўнутрыпалітычнае жыццё Рэчы Паспалітай з боку Расіі, Аўстрыі і Прусіі, дзяржаў, якія ў 1720 і 1726 гг. дамовіліся не дапусціць да рэфармавання эканамічнага і палітычнага ладу Рэчы Паспалітай, а потым і падзялілі тэрыторыю гэтай дзяржавы ў 1772, 1793 і 1795 гг. паміж сабой.

Мэтай артыкула з’яўляецца аналіз прац польскіх гісторыкаў унутрыпалітычнага становішча ў ВКЛ (1717—1763) у кантэксце польскай гістарыяграфіі эпохі панавання дынастыі Вецінаў у Рэчы Паспалітай (1697—1763).

**Стан польскай гістарыяграфіі праблемы ў перыяд з сярэдзіны XIX да сярэдзіны XX ст**. Як заўважыў Ю. А. Героўскі, эпоха панавання Сасаў (назва каралёў з дынастыі Вецінаў) у Рэчы Паспалітай доўгі час у польскай гістарычнай навуцы разглядалася праз прызму поглядаў Г. Калантая, які ў сваёй працы «Stan oњwiecienia w Polsce» (Становішча асветніцтва ў Польшчы) раскрытыкаваў палітыку караля, шляхты і каталіцкага кліру, абвінаваціўшы іх у палітычным, гаспадарчым і культурным заняпадзе дзяржавы [1, s. VI—VII]. Узмацнілі намаляваную чорнымі фарбамі карціну Калантая Г. Шміт [2] і К. Ярахоўскі [3]. Апошні падвяргаў крытыцы дзейнасць Аўгуста II, які аказаўся не ў стане супрацьдзейнічаць мясцовай магнацкай алігархіі і ўмяшальніцтву замежных дзяржаў.

Значнай перашкодай развіццю польскай гістарыяграфіі ў XIX ст. была адсутнасць уласнай дзяржавы. Тэрыторыя Польшчы была падзелена паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Адным з наступстваў паўстання 1830—1831 гг. была ліквідацыя вышэйшых навучальных устаноў, вакол якіх і групаваліся навуковыя асяродкі польскіх гісторыкаў. Акрамя таго, польская гістарыяграфія знаходзілася ў фактычнай ізаляцыі ад еўрапейскай гістарычнай навукі. Пэўным выключэннем быў уплыў прускай гістарыяграфіі. Новае пакаленне польскіх гісторыкаў навучалася ў прускіх універсітэтах (радзей у расійскіх) і таму прускія гісторыкі, як Ранке, аказвалі пэўны ўплыў на развіццё польскай гістарыяграфіі [4, s. 120—121].

Перамены да лепшага наступілі на польскіх тэрыторыях, што знаходзіліся пад уладай Аўстрыі. Паразы Аўстрыі ў Італіі (1859 г.) і ў бітве пры Садовай (1866 г.) прывялі да змен дзяржаўнага ладу і стварэння дуалістычнай Аўстра-Венгрыі, а таксама прызнання аўтаноміі некаторым тэрыторыям. Пайшлі аўстрыйскія ўлады і на саступкі польскай эліце. Сярод іншага быў праведзены працэс паланізацыі Кракаўскага і Львоўскага універсітэтаў. Вялікае значэнне мела аднаўленне кафедры польскай гісторыі ў Кракаўскім універсітэце, якая стала асновай для стварэння своеасаблівай кракаўскай гістарычнай школы. Яе даволі вядомыя прадстаўнікі Ю. Шуйскі і М. Бабжыньскі амаль цалкам пераняла інтэрпрэтацыю палітычнага становішча Рэчы Паспалітай саскіх часоў у Г. Шміта і К. Ярахоўскага. Першы з іх увогуле сцвярджаў, што

часы панавання ў Рэчы Паспалітай каралёў Аўгуста II і Аўгуста III «гісторыя мусіць безаглядна патапіць як непрадуктыўныя» [5, s. 15]. Прычынай упадку Рэчы Паспалітай Ю. Шуйскі лічыў адсутнасць сацыяльных рэформ і існаванне liberum veto [4, s. 131—132].

**Мацук Андрей Владимирович** — научный сотрудник отдела истории Беларуси средних веков и начала Нового времени Института истории НАН Беларуси, кандидат исторических наук



Шуйскі даў падрабязную характарыстыку магнацкім групоўкам Патоцкіх і Чартарыйскіх, вызначыў іх склад, прычыны ўзвышэння ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ, кантакты з замежнымі дзяржавамі [6, s. 332—333]. Недахопам прац Шуйскага было тое, што ён у сваіх даследаваннях выкарыстоўваў толькі рукапісы з архіваў і бібліятэк Кракава і Львова і нязначную колькасць копій з французскіх архіваў. За дасягненне, як трапна заўважыў Ю. А. Героўскі, неабходна прызнаць, што Шуйскаму «удалося пабудаваць удалыя канцэпцыі на слабым матэрыяле, якія былі пацверджаны пазней» [7, s. 88]. Дасягненні Шуйскага асабліва значныя ў адносінах да даследавання XVIII ст., бо да цяперашняга часу існуе шмат праблем, вывучэнне якіх не вельмі рушылася наперад, а некаторыя яго сцвярджэнні аб палітычных падзеях праўлення Аўгуста II і Аўгуста III засталіся адзінымі да сённяшняга дня [7, s. 88]. Праўда, неабходна заўважыць, што ў адносінах да ВКЛ, не ўсе канцэпцыі Шуйскага знайшлі сваё пацвярджэнне, а некаторыя яго сцвярджэнні наадварот выдаюцца памылковымі, як наконт падтрымкі Чартарыйскімі Прусіі падчас Сямігадовай вайны (1756—1763 гг.) ці іх імкнення сарваць Трыбунал ВКЛ 1763 г. [6, s. 343—345, 357].

М. Бабжыньскі ўдзяліў найбольшую ўвагу крытыцы самога Аўгуста II, які не выкарыстаў магчымасці правесці неабходныя рэформы ў Рэчы Паспалітай і ўвогуле негатыўна ацэньваў яго панаванне, нават адну з частак сваёй працы назваў «стан заняпаду» Рэчы Паспалітай [8]. На яго думку, адзінай прычынай упадку Рэчы Паспалітай была адсутнасць улады [4, s. 132].

У апазіцыі да поглядаў кракаўскай гістарычнай школы фармулявала свае палажэнні варшаўская гістарычная школа. У 50—60-х гг. XIX ст. адным з найбольш папулярных гісторыкаў быў Ю. Барташэвіч. Былі і «такія, якія лічылі яго за першага нашага (польскага. — *А. М.*) гісторыка» [9, s. 70]. Сярод іншага ён упершыню ў гістарыяграфіі пачаў вывучаць праблему атрымання «нойбургскіх уладанняў» нясвіжскай галіной роду Радзівілаў і ўплыў пытання «нойбургскай спадчыны» на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай [10]. У сваіх даследаваннях закранаў Ю. Барташэвіч і іншыя тэмы ўнутрыпалітычнай барацьбы ў ВКЛ, якія геаграфічна ў асноўным адносіліся да берасцейскага ваяводства [11]. Акрамя таго, Ю. Барташэвіч выдаў адзін з найбольш вядомых часоў дыярыушаў Завішы, які даволі падрабязна падае карціну панавання Аўгуста II. Сам Ю. Барташэвіч увогуле «саскія часы судзіў досыць сурова, асабліва крытычна апавядаў аб арыстакратыі, крытыкуя яе абыякавасць на жыццёва неабходныя справы народу, адзінае аб Чартарыйскіх пісаў з удзячнасцю. Фамілія гэта адзіная групоўка Рэчы Паспалітай, якая мела палітычны розум» [9, s. 81].

У той жа час погляды іншых прадстаўнікоў варшаўскай гістарычнай школы на гісторыю Рэчы Паспалітай XVIII ст. нязначна адрозніваліся ад поглядаў кракаўскіх гісторыкаў. А. Павіньскі, Т. Корзан, У. Смаленскі і С. Аскеназі змянілі толькі акцэнты на ацэнку Рэчы Паспалітай у «саскія часы». На іх думку, галоўнымі прычынамі ўпадку Рэчы Паспалітай былі знешнія: палітыка суседніх краін па зрыву рэформаў у Рэчы Паспалітай і іх імкненне любымі сродкамі захаваць яе слабасць [12; 13]. Яны разглядалі гісторыю Рэчы Паспалітай 1717—1763 гг. праз прызму прац усё таго ж Г. Калантая і заснаваных на яго поглядзе

інтэрпрэтацый сваіх папярэднікаў. Асноўную ўвагу ў сваіх працах гэтыя аўтары звярталі на падзелы Рэчы Паспалітай, шукаючы ў папярэдніх часах толькі іх прычыны. Адзіная розніца была ў тым, на што яны ставілі акцэнты ў сваіх даследаванях: на ўнутрыпалітычныя («кракаўская школа») ці знешнепалітычныя («варшаўская школа») прычыны падзелу Рэчы Паспалітай.

Былі і працы ў якіх непасрэдна разглядалася палітычная гісторыя ВКЛ у XVIII ст. Перыяду гісторыі ВКЛ 1717—1763 гг. была прысвечана работа К. Барташэвіча [14]. Тут ён даследаваў, між іншым, і дзейнасць рода Радзівілаў у палітычным жыцці ВКЛ. Не заставіла па-за ўвагай «саскія часы» і львоўская гістарычная школа. У Львове плённа працаваў над вывучэннем «часоў Сасаў». К. Кантэцкі. Прыналежнасць Львова да Аўстра-Венгрыі дала яму магчымасць вывучыць падзеі бескаралеўя 1733 г. на падставе матэрыялаў венскіх архіваў [15; 16]. Ён жа з'яўляецца аўтарам манаграфіі аб С. Панятоўскім, якая напісана з архіўных крыніц [17].



Вывучалася «саская эпоха» і ў эмігранцкім асяродку польскіх гісторыкаў. Найбольш значным даследаваннем была выдадзеная ў Кракаве манаграфія К. Валішэўскага «Potoccy i Czartoryscy. Walka stronictw i programow politycznych przed upadkiem Rzeczypospolitej 1734—1754» (Патоцкія і Чартарыйскія. Барацьба груповак і палітычных праграм перад упадкам Рэчы Паспалітай 1734—1754) [18]. У ёй аўтар зрабіў спробу вызначыць склад магнацкіх груповак, іх палітычную праграму, а таксама прасачыць іх кантакты з Францыяй і Расіяй. Валішэўскі выкарыстаў значную колькасць крыніц у французскіх архівах, але не заўсёды супастаўляў і параўноўваў іх з іншымі крыніцамі, што паніжае вартасць яго працы.

Больш грунтоўна ў параўнанні з папярэднікамі гісторыю Рэчы Паспалітай «саскіх часоў» даследаваў у сваіх шматлікіх манаграфіях і артыкулах У. Канапчыньскі [19; 20; 21; 22; 23; 24; 25; 26]. Прычым у некаторых са сваіх прац ён удзяляў увагу толькі падзеям перыяду паміж Паўночнай вайной і падзеламі Рэчы Паспалітай. Прычынай упадку Рэчы Паспалітай, як і іншыя прадстаўнікі кракаўскай гістарычнай школы, Канапчыньскі бачыў ва ўсеўладдзе шляхты і liberum veto [7, s. 220].

У. Канапчыньскі, які з'яўляецца адным з класікаў польскай гістарычнай навукі, як гісторык палітычнай гісторыі Рэчы Паспалітай, быў першым, хто звярнуў увагу і пераканаўча даказаў, што ўжо ў час панавання Вецінаў у грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай зарадзіліся ідэі перабудовы дзяржавы, якія сваю рэалізацыю знайшлі ўжо ў часы панавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пры гэтым У. Канапчыньскі акцэнтаваў сваю ўвагу на рэфарматарскіх поглядах Чартарыйскіх, на доўгі час прадвызначыў і погляд наступных пакаленняў польскіх гісторыкаў на «саскую эпоху». Ён заключаўся ў далейшым негатыўным стаўленні да супернікаў Чартарыйскіх у палітычным жыцці Рэчы Паспалітай («рэспубліканцаў» Патоцкіх ці «камарылы Мнішака») і ВКЛ (Радзівілы). Асабліва не пажалеў ён «камарылью Мнішака», якая, на яго погляд была групоўкай кар'ерыстаў. Перыяд 1752—1763 гг., калі «камарылья Мнішака» была прыдворнай партыяй, а Чартарыйскія знаходзіліся ў апазіцыі, Канапчыньскі фактычна ўбачыў як малаперспектыўныя «саскія хаосы» і «канфедэрацкія лабірынты» [7, s. 223].

Вялікім плюсам даследаванняў Канапчыньскага было ўвядзенне вялікай колькасці раней невядомых крыніц з польскіх і замежных архіваў. Значная частка гэтых крыніц змешчана ў прыпісках да манаграфій Канапчыньскага. Іх ён знайшоў падчас сваіх пошукаў з 1904 па 1912 г. у архівах Польшчы, Расіі, Прусіі, Саксоніі, Аўстрыі, Англіі, Францыі, Швецыі і Даніі. Вядома, што ў архівах У. Канапчыньскі працаваў ад ранка да вечара. Менавіта за выкарыстанне ў сваіх працах вялікай колькасці крыніц Канапчыньскі атрымаў у сваіх сучаснікаў назву «архіважэрцы» [7, s. 211—212].

Вялікае значэнне мела манаграфія М. Скібіньскага «Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriack№ w latach 1740—1745» (Еўропа і Польшча падчас вайны за «аўстрыйскую спадчыну ў 1740—1745 гг. » [27]. Нягледзячы на выказаныя У. Канапчыньскім заўвагі [28], кніга М. Скібіньскага мае вялікую навуковую вартасць. У ёй упершыню падрабязна было даследавана ўнутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай 1740—1745 гг., уплыў на яго вайны за «аўстрыйскую спадчыну» і звязаных з ёй планаў Аўгуста III стаць імператарам. У другім томе манаграфіі аўтар змягчае вялікую колькасць крыніц з польскіх, нямецкіх, аўстрыйскіх, французскіх і англійскіх архіваў.

**Польская гістарыяграфія праблемы ў 1950 гг. — пачатку XXI ст.** Пасля Другой сусветнай вайны працягвалі свае даследванні «саскіх часоў» вядомыя даваенныя гісторыкі У. Канапчыньскі і Ю. Фельдман [29, s. 113]. Рост новай хвалі зацікаўленасці польскіх гісторыкаў «саскімі часамі» былі звязаны з двума падзеямі пачатку 50-х гг. XX ст.: навуковай сесіяй, прысвечанай Г. Калантаю (1951 г.) і Першай метадалагічнай канферэнцыяй польскіх гісторыкаў (1951—1952 гг.). Апошняя, праўда, была скіравана ў асноўным на пытанні сацыяльна-эканамічнай гісторыі Рэчы Паспалітай XVIII ст. У гэты час адбываецца сталінізацыя польскай гістарычнай навукі. У выніку месца навуковых даследаванняў займаюць працы, вытрыманыя ў духу



сталінскай ідэалогіі [4, s. 206—207, 210—211]. Смерць Сталіна пацягнула палітычныя перамены не толькі ў СССР, але і ў Польшчы. Новая палітычная сітуацыя знайшла сваё адлюстраванне ў гістарычнай навуцы. У 1956 г. на пасяджэнні Польскага гістарычнага таварыства даследчыкі раскрытыкавалі сталінізацыю гісторыі і адмовіліся ад выкарыстання ідэалогіі сталінізму ў гістарычным даследаванні [4, s. 213]. Пачынаючы з гэтага часу ў польскую гістарычную навуку вяртаюцца даследаванні па ўнутрыпалітычнай гісторыі. Спрэчкі аб ацэнцы часоў панавання дынастыі Вецінаў у асноўным разгарнуліся на з’ездах польскіх гісторыкаў у Кракаве (1958) і Любліне (1969).

У гэты час польская гістарыяграфія «саскіх часоў» папоўнілася працамі Ю. А. Героўскага. Ён стаў заснавальнікам «новай кракаўскай гістарычнай школы», галоўнай асаблівасцю якой стала тое, што асноўная ўвага ў даследаваннях была звернута менавіта на «саскія часы» [1; 30—38].

Упершыню пытанні развіцця Рэчы Паспалітай у апошнія гады панавання Аўгуста II і праблемы фармавання ім сістэмы знешнепалітычных саюзаў, якія павінны былі ўзмацніць геапалітычнае становішча Рэчы Паспалітай, Саксоніі і тым самым умацаваць пазіцыі дынастыі Вецінаў, былі разгледжаны ў даследаванні іншага прадстаўніка кракаўскай школы Э. Раствароўскага [39]. Апрача таго, што ім быў уведзены ў навуковае абарачэнне значны масіў новых дадзеных, якія характарызавалі ўвесь спектр міжнародных адносін 20-х — пачатку 30-х гг. і месца ў ім Саксоніі і Рэчы Паспалітай, французскую палітыку ў адносінах да іх, была прааналізавана таксама структура апазіцыі каралеўскай уладзе ў Рэчы Паспалітай і развіццё яе міжнародных кантактаў. У выніку аўтар, на падставе ў асноўным рэляцый французскага пасла А. Ф. Манці, прыйшоў да высновы, што галоўная апазіцыя каралеўскай уладзе зыходзіла ад магнатэрыі ВКЛ. Ён паказаў, што гэтая апазіцыя не складалася з якогась аднаго роду, а ўключала ў свае шэрагі большасць магнатаў і шляхты ВКЛ. Ён першы заўважыў, што прымірэнне Радзівілаў і Сапегаў у пытанні «нойбургскіх уладанняў», прывяло да аб’яднання іх пазіцый у змаганні супраць палітыкі, якая праводзілася ў Рэчы Паспалітай Аўгустам II.

Значную ўвагу вывучэння «сістэмнай логікі» міждзяржаўных адносін Усходняй Еўропы ўдзяліў Э. Раствароўскі ў сваім артыкуле [40]. Каштоўнасць гэтай працы ў шэрагу новых ідэй і падыходаў, якія былі

прапанаваны ім для асмыслення ўзаемасувязі паміж зменамі міжнароднай сітуацыі і геапалітычным становішчам Рэчы Паспалітай.

Даследаванні «саскіх часоў» Героўскага і Раствароўскага працягнула новае пакаленне кракаўскіх гісторыкаў. М. Маркевіч у сваіх даследаваннях пераканаўча паказаў, як функцыяніравала Рэч Паспалітая без сойму, за кошт узрастання значэння пасяджэнняў Сената ў панаванне Аўгуста II. Пры такой пастаноўцы праблемы аўтар толькі ў нязначнай меры закранаў сітуацыю ў ВКЛ [41—45].

Адной з першых прац, якая ахоплівала асобны аспект унутранай палітыкі 1736—1738 гг., стала манаграфія Х. Палькія [46]. У ёй аўтар на падставе вялікай колькасці крыніц разгледзеў падзеі соймаў 1736 і 1738 гг. і ўнутрыпалітычную барацьбу ў дзяржаве. Пашырыў іх даследаванне аўтар у сваіх іншых артыкулах [47; 48]. Не пакідае па-за ўвагай ён у сваёй манаграфіі і артыкулах і ўнутрыпалітычную сітуацыю ў ВКЛ. На падставе матэрыялаў з польскіх і нямецкіх архіваў Х. Палькі складае карціну расстаноўкі асноўных палітычных сіл у ВКЛ у 1736—1738 гг.

М. Чэппе змагла разглядзець праблему дзейнасці прыдворнай магнацкай групоўкі «Камарылы Мнішака» на аснове аналізу перапіскі кароннага надворнага маршалка Ю. Мнішка [49—52]. Насуперак поглядаў Канапчыньскага, яна паказвае рацыяналізм дзейнасці «камарылы Мнішака». Аднак услед за Канапчыньскім заўважае, што значная частка лідэраў «камарылы Мнішака» былі асобамі, якія ўвайшлі ў яе склад толькі дзеля сваёй кар'еры. Значнае месца ў працы было прысвечана і дзейнасці саюзнікаў прыдворнай партыі Ю. Мнішака — магнацкай групоўкі Радзівілаў. Вызначала слабую заангажаванасць каралеўскага двара ў 50-х — пачатку 60-х гг. XVIII ст. ва ўнутрыпалітычную сітуацыю ў ВКЛ. На сённяшні дзень у Кракаве працягваюць вывучацца і толькі асобныя аспекты ўнутранай палітыкі Рэчы Паспалітай, якія амаль не



датычацца ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ. Да такіх даследаванняў можна аднесці манаграфіі А. Совы, А. Ронікера [53; 54].

Некаторыя асобныя пытанні палітычнага развіцця ВКЛ з 1717 па 1763 г. атрымалі асвятлення ў працах польскіх даследчыкаў у эміграцыі. Так, С. Касцялкоўскі ў сваёй манаграфіі аб Антоніі Тызенгаўзе закрануў некаторыя фрагменты палітычнай гісторыі Наваградскага і Гарадзенскага паветаў ВКЛ [55].

На палітыку Аўгуста II у сваіх даследаваннях звяртаў увагу гісторык з Торуня Я. Сташэўскі. Ён стаў аўтарам біяграфій каралёў Рэчы Паспалітай Аўгуста II і Аўгуста III Вецінаў [56; 57]. Біяграфія Аўгуста II выклікала даволі значны рэзананс, бо Я. Сташэўскі зноў падняў у ім свае меркаванні наконт яго элекцыі і планаў у апошнія гады панавання, якія супярэчылі ўсталяваўшамуся ў гістарычнай навуцы погляду. Я. Сташэўскі адзначыў вельмі слабую ступень даследаванасці гісторыі Рэчы Паспалітай часоў панавання Аўгуста III. Вельмі карысным у біяграфіях Аўгуста II і Аўгуста III было тое, што Я. Сташэўскі супаставіў, параўнаў дзеянні абодвух Аўгустаў у Саксоніі і Рэчы Паспалітай. На падставе гэтага ён і рабіў пэўныя высновы аб іх магчымых дзеяннях у Рэчы Паспалітай.

Заслугоўваюць увагі і іншыя працы Я. Сташэўскага [58; 59; 60]. У адной з іх ён прапанаваў дыяметральна супрацьлеглы ад усталяваўшагася ў гістарычнай навуцы погляду на прычыны зрыву сойму 1744 г. [61]. Сваю канцэпцыю ён грунтаваў у асноўным як на пэўных зменах у структуры ўлады ў Рэчы Паспалітай, так і палітыцы Саксоніі. Я. Сташэўскі разам з Ю. А. Героўскім узнялі вельмі вострае пытанне аб значэнні персанальнай уніі з Саксоніяй для гісторыі Рэчы Паспалітай. У выніку вывучэнне ролі каралеўскага двара ў Рэчы Паспалітай «саскіх часоў» становіцца адной з галоўных тэм кракаўскага і торуньскага асяродку гісторыкаў.

Палітычныя працэсы, якія адбываліся на землях Вялікага княства Літоўскага з 1717 па 1763 г., прыцягвалі ўвагу і іншых польскіх даследчыкаў. Аднак найчасцей рабілася гэта ў кантэксце даследавання імі прававога ўстройства Рэчы Паспалітай. Да такіх прац можна аднесці манаграфіі Г. Альшэўскага і Ю. Міхальскага [62; 63]. Апошні зрабіў слушную выснову аб тым, што менавіта ў часы панавання Вецінаў з'явіліся шэраг шляхціцаў новага пакалення, якія надалей прынялі актыўны ўдзел у праграмме рэформаў у час панавання Станіслава Аўгуста. Агляд маёмаснага і палітычнага становішча магнацкага роду Радзівілаў у XVIII ст. зрабілі ў сваім артыкуле З. Анусік і А. Страйноўскі [64]. Яны пераканаўча паказалі залежнасць росту палітычнай вагі нясвіжскай галіны роду Радзівілаў ад павелічэння колькасці іх зямельных уладанняў.

Працягваліся даследаванні гісторыі Рэчы Паспалітай 1717—1763 гг. і ў Варшаве. Вялікую працу па вывучэнні палітыкі Чартарыйскіх з 1743 па 1752 г. правяла варшаўская даследчыца З. Зяліньская ў сваёй манаграфіі «Walka Familii o reforme Rzeczypospolitej w latach 1743—1752» (Барацьба Фаміліі аб рэформе Рэчы Паспалітай у 1743—1752 гг.) [65]. Нягледзячы на крытычныя заўвагі ў рэцэнзіі кракаўскіх гісторыкаў [66], нельга не заўважыць вялікае значэнне манаграфіі З. Зяліньскай для далейшых даследаванняў гісторыі Рэчы Паспалітай 1743—1752 гг. Аўтарка стала першай даследчыцай, якая даследавала перыяд гісторыі ад 1746 да 1750 г. Пры напісанні гэтага даследавання было выкарыстана шмат крыніц з польскіх, аўстрыйскіх, нямецкіх і французскіх архіваў. Даследчыца змагла прасачыць прычыны разрыву Фаміліі з дваром і паказаць размеркаванне прыхільнікаў Чартарыйскіх па рэгіёнах Рэчы Паспалітай. Манаграфія ў асноўным тычыцца палітыкі каралеўскага двара і падзеяў у Кароне, сітуацыя ў ВКЛ абмяжоўваецца апісаннем падзей на Трыбуналах ВКЛ і спробай вылучэння тут шляхецкай кліентэлы Чартарыйскіх. Аднак неабходна заўважыць, што даследчыца засігналізавала шмат праблемаў, вывучэнне якіх павінна дапамагчы ў даследаванні ўнутрыпалітычнага становішча ў ВКЛ: размеркаванне павятовых урадаў, значэнне выбараў маршалкаў і пісараў Трыбунала ВКЛ, рэгіянальныя ўплывы магнацкіх груповак.

З. Зяліньская даследавала на падставе дыярыуша Марціна Матушэвіча і механізмы дзейнасці розных магнацкіх груповак у Брэсцкім ваяводстве ў часах панавання Вецінаў [67]. Яшчэ адна



манаграфія С. Зяліньскай тычыцца адносін Расіі і Рэчы Паспалітай у XVIII ст. Асаблівасцю гэтай працы з'яўляецца тое, што даследаванне было праведзена ў асноўным на невядомых матэрыялах, што захоўваюцца ў архіве знешняй палітыкі Расійскай імперыі [68]. Такім чынам, гэтая праца З. Зяліньскай фактычна дапаўняе ранейшыя даследаванні гісторыкаў на тэму ўзаемаадносін Расіі і Рэчы Паспалітай на падставе новых фактаў. У сваіх працах З. Зялінская працягнула сваю завочную дыскусію з іншымі польскімі даследчыкамі аб падзеях сойма 1744 г. і міжнароднай сітуацыі ў гэты момант [27; 28].

На падставе матэрыялаў Галоўнага архіва старажытных актаў пэўныя аспекты ўнутрыпалітычнага жыцця ВКЛ паказала вядомая даследчыца і адначасова супрацоўніца гэтага архіва Т. Зяліньская [69; 70; 71]. Праблему «нойбургскай спадчыны» разгледзеў іншы архівіст Галоўнага архіва старажытных актаў Ю. Лесіньскі [72]. На падставе вялікай колькасці крыніц ім быў устаноўлены склад гэтых уладанняў. Не пакінуў ён па-за сваёй увагай і гісторыю стварэння «нойбургскіх ўладанняў», а таксама прычыну з'яўлення і пашырэння праблемы «нойбургскіх уладанняў» ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ.

Соймікі ВКЛ на падставе аналізу троцкага сойміка даследаваў у сваёй манаграфіі А. Закшэўскі [73]. Асноўную ўвагу аўтар зрабіў на аналізе заканамернасцей і супярэчнасцей устройства і функцыяніравання троцкага сойміка. Яго манаграфія дазваляе вылучыць асаблівасці палітычнай барацьбы на павятовых і ваяводскіх сойміках ВКЛ на прыкладзе троцкага сойміка, у тым ліку і з 1717 па 1763 г. Дапаўняюць

выкладзеную ў манаграфіі інфармацыю шматлікія артыкулы гэтага ж аўтара па гісторыі парламентарызму ВКЛ XVI—XVIII ст. [74; 75; 76; 77].

А. Рахуба даволі глыбока разгледзеў парламентарную сістэму ВКЛ XVI—XVIII ст. [78; 79]. Аўтар на падставе вялікай колькасці крыніц паказаў асаблівасці функцыяніравання павятовых соймікаў у ВКЛ і іх ролю ў парламентарнай сістэме Княства. А. Рахубе ўдалося выявіць і пэўныя заканамернасці ўплываў магнацкіх груповак у розных рэгіёнах Княства. Біяграфіі прадстаўнікоў роду Цеханавецкіх таксама даюць магчымасць прасачыць барацьбу магнацкіх груповак у Браслаўскім павеце і Мсціслаўскім ваяводстве [80]. А. Рахуба разам з Х. Люлевічам і П. Раманюком і пры дапамозе сваіх беларускіх калег збірае і выдае спісы павятовыхураднікаў ВКЛ, дэпутатаў Трыбунала ВКЛ [81; 82; 83; 84]. Гэтыя спісы ўраднікаў і дэпутатаў значна дапамагаюць і аблягчаюць працу іншым даследчыкам у вывучэнні розных праблем гісторыі ВКЛ XVI—XVIII ст.

Іншы варшаўскі гісторык В. Крыегсайсэн у сваім даследаванні становішча пратэстантаў у Рэчы Паспалітай у эпоху панавання каралёў з дынастыі Вецінаў шмат увагі ўдзяліў і сітуацыі ў ВКЛ [85]. Ён справядліва заўважае, што становішча пратэстантаў у Княстве было няшмат лепшым, чым у Малапольшчы ці Вялікапольшчы. Робіць спробу адсачыць кантакты пратэстантаў з замежнымі дзяржавамі і аналізуе дзейнасць пратэстантаў ва ўнутрыпалітычным жыцці Рэчы Паспалітай. У іншым сваім даследаванні В. Крыегсайсэн звяртаецца да маладаследаванага падарожжа Яна Казіміра і Пятра Сапегаў у Пецярбург у 1726 г. для заключэння брака апошняга з дачкой Аляксея Меньшыкава, Марыяй. На падставе шматлікіх фактаў аўтар паказвае імкненне Сапегаў з дапамогай вяселля ўзмацніць супрацоўніцтва з расійскай правячай элітай супраць караля Аўгуста II [86].

В. Каркуціньска ў сваёй манаграфіі, прысвечанай Ганне з Сангушкаў Радзівіл, фактычна зрабіла агляд унутрыпалітычнага становішча ў ВКЛ у 20-х — 30-х гг. XVIII ст. Асаблівую ўвагу яна надала аналізу ролі і месца Радзівілаў у ВКЛ [87].

Вучаніца З. Зяліньскай У. Касіньска звярнулася да даследавання гісторыі Рэчы Паспалітай канца першага — пачатку другога дзесяцігоддзя XVIII ст. [88; 89; 90; 91]. Яна пераканаўча паказала, што перад Рэччу Паспалітай у выніку далучэння да Венскага трактату быў шанц паменшыць уплывы Расіі на ўнутрыпалітычнае становішча ў дзяржаве. Аднак менавіта расійская падтрымка антыкаралеўскай апазіцыі перашкодзіла рэалізацыі гэтых планаў. Даволі падрабязна У. Касіньская аналізуе кантакты расійскага ўрада з магнатэрыяй ВКЛ.



Прадстаўнік вроцлаўскай гістарычнай школы Т. Цесельскі даследаваў іншы аспект унутрыпалітычнай гісторыі гэтага перыяду — барацьбу каралеўскага двара супраць апазіцыі гетманаў. [92] Асноўная ўвага ў артыкуле звяртаецца на антыкаралеўскую дзейнасць каронных гетманаў А. Сеняўскага і М. Жавускага, але і апазіцыйныя крокі гетманаў ВКЛ Л. Пацея і С. Дэнгофа не застаюцца па-за ўвагай аўтара.

Важнай для разумення агульных тэндэнцый палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай канца панавання Аўгуста II стала манаграфія прадстаўніка катавіцкай гістарычнай школы Я. Курка [93], у якой была разгледжанна ўнутрыпалітычная сітуацыя Рэчы Паспалітай у апошнія гады панавання Аўгуста II. У сваім артыкуле Я. Курак разгледзеў сітуацыю з даследаваннем парламентарызму часоў панавання Аўгуста II і Аўгуста III [94]. Ён робіць слушную выснову, што, нягледзячы на павелічэнне колькасці даследаванняў гісторыі «саскіх часоў», некаторыя тэмы амаль не вывучаюцца ў польскай гістарыяграфіі.

Значным укладам у вывучэнне палітычнай гісторыі ВКЛ 1717—1763 гг. з'яўляюцца артыкулы ў Польскім слоўніку Біяграфічным [95]. Сярод іх артыкулы пра палітычных дзеячаў ВКЛ XVIII ст. аўтарства А. Рахубы, П. Раманюка, З. Зялінскай, А. Совы, Х. Палькія, А. Лінк-Ленчоўскага, Г. Дымніцкай-Валачынскай. Даволі часта яны з'яўляюцца адзінай інфармацыяй пра дзейнасць той ці іншай асобы і палітычных падзеях у ВКЛ. Сярод іншага спіс крыніц да гэтых артыкулаў дазваляе вызначыць кола крыніц, якія звязаны з дзейнасцю таго ці іншага дзеяча ва ўнутрыпалітычнай барацьбе ў ВКЛ.

У канцы 90-х гг. XX ст. — пачатку XXI ст. у польскай гістарыяграфіі значна павялічылася навуковае даследаванне бескаралеўя 1733—1736 гг. Паміж рознымі гісторыкамі разгарнулася дыскусія аб падзеях бескаралеўя, іх прычынах і аб тым, ці можна было пазбегнуць умяшальніцтва замежных дзяржаў. З'явілася шмат навуковых артыкулаў па розных аспектах праблемы [96; 97; 98; 99; 100; 101]. Даследаванню міжнароднай сітуацыі і дзейнасці замежных паслоў у Рэчы Паспалітай прысвяціў некалькі сваіх артыкулаў торуньскі даследчык Е. Дыгдала, які выкарыстоўваў пры іх напісанні раней невядомыя матэрыялы з архіваў Вены і Дрэздэна [102; 103; 104; 105; 106; 107; 108; 109]. Яшчэ адзін яго артыкул прысвечаны вывучэнню дысідэнцкага пытання падчас бескаралеўя. Даследаваў ён і пытанні палітычных кантактаў магнатэрыі Княства і Кароны падчас бескаралеўя.

Даследаваннем праблем бескаралеўя займаюцца таксама кракаўская даследчыца Е. Шклярска [110; 111; 112] і прадстаўнік катавіцкай гістарычнай школы А. Лісек [113; 114]. Калі Е. Шклярска звяртае ўвагу ў першую чаргу на агульную сітуацыю ў Рэчы Паспалітай, то А. Лісек асноўную ўвагу ў сваіх даследаваннях ўдзяляе ўкраінскім ваяводствам Кароны і ВКЛ. Праўда, у сваіх даследаваннях аўтару не ўдалося пазбегнуць значнай колькасці памылак, якая звязана з неразуменнем асаблівасцей ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ. У той жа час асноўная карысць яго артыкулаў заключаецца ва ўвядзенні ў навуковы абарот раней невядомых крыніц.

Такім чынам, у апошнія гады адбылося пэўнае павелічэнне зацікаўленасці польскіх даследчыкаў гісторыяй Рэчы Паспалітай «саскіх часоў». Гісторыя Рэчы Паспалітай вывучаецца вроцлаўскай, варшаўскай, катавіцкай, кракаўскай, торуньскай гістарычнымі школамі. Вельмі карысна, што ў цэнтры іх увагі знаходзяцца як Карона, так і Вялікае княства. У той жа час неабходна звярнуць увагу, што даследаванні польскіх гісторыкаў носяць няроўны храналагічны характар. Некаторыя праблемы не вывучаюцца наогул, а па іншых ужо напісана даволі шмат манаграфій і артыкулаў (напрыклад, падзеі бескаралеўя 1733 г., сойм 1744 г.). Найбольш маштабныя даследаванні эпохі панавання Вецінаў у Рэчы Паспалітай праводзяцца ў Кракаве. Аднак у адносінах да вывучэння гісторыі ВКЛ 1717—1763 гг. найбольш даследаванняў праводзіцца варшаўскай гістарычнай школай.

---

**ЛІТАРАТУРА**

1. Gierowski, J. Rzeczpospolita w dobie upadku 1700—1740. Wybyr ųrydei / J. Gierowski. Wrociaw : Wydawnictwo Ossolicskich, 1955. 316 s.



2. Schmitt, H. Dzieje Polski XVIII i XIX wieku, T. I / H. Schmitt. Krakyw, 1866. 407 s.

3. Jarochowski, K. Nowe opowiadania i studia historyczne / K. Jarochowski. Warszawa : Gebethner & Wolff, 1882. 445 s.

4. Grabski, A. Zarys historii historiografii polskiej / A. Grabski. Poznac : Wydawnictwo Poznacskie, 2000. 278 s.

5. Olszewski, H. Epoka saska w ocenie historiografii polskiej / H. Olszewski // Miкdzy wielk№ polityk№ a szlacheckim partykularzem: Studia z dziejyw nowoïytnej Polski i Europy ku czci Profesora Jacka Staszewskiego; red. K. Wajda. Toruc, 1993. S. 13—29.

6. Szujski, J. Dzieje Polski. T. 4 / J. Szujski. Lwyw, 1866. T. 4, Cz. II. 1866. 574 s.

7. Spyr o historyczna szkoiк krakowsk№. Krakyw : Wydawnictwo literackie, 1972. 374 s.

8. Bobrzycski, M. Dzieje Polski w zarysie, T. 2 / M. Bobrzycski. Warszawa; Krakyw; Jydџ; Paryï; Poznac; Wilno; Zakopane, 1890. 387 s.

9. Maternicki, J. Warszawskie њrodowisko historyczne 1832—1869 / J. Maternicki. Warszawa : PWN, 1970. 313 s.

10. Bartoszewicz, J. Zamek Bialski / J. Bartoszewicz. Lwyw, 1881. 218 s.

11. Bartoszewicz, J. Szkice z czasyw saskich / J. Bartoszewicz. Krakyw, 1880. 395 s.

12. Askenazy, S. Dwa stulecia XVIII i XIX / S. Askenazy. Warszawa, 1901. 477 s.

13. Smolecski, W. Przewryt umysiowy w Polsce wieku XVIII. Studia historyczne / W. Smolecski. Warszawa, 1891. 424 s.

14. Bartoszewicz, K. Radziwiiiowie / K. Bartoszewicz. Warszawa; Krakyw, 1928. 320 s.

15. Kantecki, K. Po zgonie Augusta II / K. Kantecki // Przewodnik naukowy i literacki. 1877. S. 673—688, 767—786, 865—887, 961—989, 1057—1083.

16. Kantecki, K. Stronnictwo saskie w Polsce roku 1733: kilka rysyw do charakterystyki ludzi i czasu / K. Kantecki // Niwa. 1877. rocznik 6. T. 11. S. 631— 646, 697— 709, 772— 784, 856— 866.

17. Kantecki, K. Stanisiaw Poniatowski kasztelan krakowski, ojciec Stanisiawa Augusta: 2 t. / K. Kantecki. Poznac, 1880. T. 1—2.

18. Waliszewski, K. Potoccy i Czartoryscy. Walka storonictw i programyw politycznych przed upadkiem Rzeczypospolitej 1734—1754 / K. Waliszewski. Krakyw : Drukarnia Uniwersyteta Jagieiiocskiego, 1880. 251 s.

19. Konopczycski, W. Polska przed wojn№ siedmioletni№ / W. Konopczycski // Biblioteka Warszawska. 1907. T. 1. S. 457—495.

20. Konopczycski, W. Polska w dobie wojny siedmioletniej: 2 t. / W. Konopczycski. Warszawa; Krakyw : Druk Wi. L. Anczyca i Spolki, 1909—1911. T. 1—2.

21. Konopczycski, W. Sejm grodziecski 1752 roku / W. Konopczycski. Lwyw : Drukarnia Ludowa, 1912. 118 s.

22. Konopczycski, W. Od Sobieskiego do Kosciuszki. Szkice, drobiazgi fraszki historyczne / W. Konopczycski. Krakyw : Druk Wi. L. Anczyca i Spolki, 1921. 353 s.

23. Konopczycski, W. Polska a Szwecja od pokoju oliwskiego do upadku Rzeczypospolitej: 1660—1795 / W. Konopczycski. Warszawa : Wydawnictwo kasy im. Mianowskiego Instytutu popierania polskiej twyrczoњci naukowej, 1924. 390 s.

24. Konopczycski, W. Dzieje Polski nowoïytnej: t. 1—2. T. 2. 1648—1795 / W. Konopczycski. Warszawa; Krakyw : Gebethner i Wolff, 1936. 460 s.

25. Konopczycski, W. Polska a Turcja 1683—1792 / W. Konopczycski. Warszawa : Gebethner & Wolff, 1936. 316 s.

26. Konopczycski, W. Fryderyk Wielki a Polska / W. Konopczycski. Poznac : Instytut zachodni, 1981. 266 s.

27. Skibicski M. Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriack№: t. 1—2 / M. Skibicski. Krakyw : Akademia Umiejкtnoњci, 1912—1913.№T. 1. 1912. 844 s., T. 2. 1913. 719 s.

28. Konopczycski, W. [Recenzja] / W. Konopczycski // Kwartalnik Historyczny. 1914. T. XXVIII. S. 227—254. Рэц. на кн.: Skibicski M., Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriack№: t. 1—2. Krakyw : Akademia Umiejкtnoњci, 1912—1913. T. 1. 1912. 844 s., T. 2. 1913. 719 s.

29. Zahorski, A. Polska historiografia XVIII wieku po drugiej wojnie њwiatowej / A. Zahorski // Kwartalnik Historyczny. 1987. Z. 1. S. 113—144.

30. Gierowski, J. «Opisanie» urzкdyw centralnych przez konfederatyw tarnogrodzkich / J. Gierowski // O naprawк Rzeczypospolitej XVII—XVIII w. Prace ofiarowane Wiadysiawowi Czaplicskiemu w 60 rocznicк urodzin, Warszawa, 1956. S. 195—204.



31. Gierowski, J. Wokyi mediacji w traktacie warszawskim / J. Gierowski // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellocskiego. Prace Historyczne. 1969. Z. 26. S. 57—68.

32. Gierowski, J. Polska, Saksonia i plany absolutyczne Augusta II / J. Gierowski // Polska w epoce Oњwiecenia. Warszawa, 1971. S. 60—105.

33. Gierowski, J. U џrydei polskiego Oњwiecenia / J. Gierowski // Wiek XVIII. Polska i њwiat. Ksiкga poњwiкcona B. Leњnodorskiemu. Warszawa : PIW, 1974. S. 41—50.

34. Gierowski, J. A. Dyplomacja polska doby saskiej (1696—1763) / J. Gierowski // Historia dyplomacji polskiej, T. II. Warszawa, 1982. S. 331—481.

35. Gierowski, J. A. Stosunki polsko-austriackie w czasach saskich / J. Gierowski // Sobytka. ЊlЉski Kwartalnik Historyczny. 1983. Z. 4. S. 517—526.

36. Gierowski, J. A. Rozkiad pacstwowoњci szlacheckiej w czasach saskich / J. Gierowski // Miкdzy Wschodem a Zachodem. Rzeczpospolita XVI—XVIII w. Studia ofiarowana Z. Wyjcikowi w siedemdziesiЉtЉ rocznicк urodzin / Pod. red. T. Chynczewskiej-Hennel, M. Kuleckiego. Warszawa, 1993. S. 187—195.

37. Gierowski, J. A. The Polish-Lithuanian Commonwealth in the XVIII-th century. From anarchy to welll-organized stale / J. Gierowski. Krakyw : PAN, 1996. 282 s.

38. Gierowski, J. Rzeczypospolita jako zwornik Europy њrodkowowschodniej / J. Gierowski // Rzeczpospolita wielu narodyw i jej tradycje. Materiaiy z konferencji «Trzysta lat od poczЉtku unii polsko-saskiej. Rzeczpospolita wielu narodyw i jej tradycje», Krakyw 15—17 IX 1997 r. / Pod redakcjЉ Andrzeja K. Link-Lenczowskiego i M. Markiewicza. Krakyw : Towarzystwo Wydawnicze «Historia Iagellonica», 1999. S. 217—225.

39. Rostworowski, E. O polskЉ koronк. Polityka Francji w latach 1725—1733 / E. Rostworowski. Wrociaw — Krakyw: Ateneum, 1958. 364 s.

40. Rostworowski, E. Podbyj ЊlЉska przez Prusy a pierwszy rozbiyr Polski / E. Rostworowski // PrzeglЉd Historyczny. 1972. Z. 3. S. 398—412.

41. Markiewicz, M. «Jedyna i nieporywnalna?» — normalne pacstwo europejskie czy moїe pacstwo pogranicza? / M. Markiewicz // Miкdzy Zachodem a Wschodem. Studia z dziejyw Rzeczypospolitej w epoce nowoїytnej / Pod. red. J. Staszewskiego, K. Mikulskiego i J. Dumanowskiego. Toruc : Wydawnictwo «Adam Marszaiek», 2002. S. 17—22.

42. Markiewicz M. Pacstwa wielonarodowe w Europie osiemnastego wieku / M. Markiewicz // Rzeczpospolita wielu narodyw i jej tradycje. Materiaiy z konferencji «Trzysta lat od poczЉtku unii polsko-saskiej. Rzeczpospolita wielu narodyw i jej tradycje», Krakyw 15—17 IX 1997 r. / Pod redakcjЉ Andrzeja K. Link-Lenczowskiego i M. Markiewicza. Krakyw : Towarzystwo Wydawnicze «Historia Jagellonica», 1999. S. 23—31.

43. Markiewicz, M. Rzeczpospolita bez sejmu. Funkcjowanie pacstwa / M. Markiewicz // Miкdzy barokiem a oњwieceniem. Nowe spyjrzenie na czasy saskie / red. K. Stasiewicz, S. Archemczyk. Olsztyn, 1996. S. 175—179.

44. Markiewicz, M. Rady senatorskie Augusta II (1697—1733) / M. Markiewicz. Wrociaw : Ossolineum, 1988. 128 s.

45. Markiewicz, M. Rady senatu za Augusta III / M. Markiewicz // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellocskiego, Prace Historyczne. 1985. Z. 77. S. 69—89.

46. Palkij, H. Sejmy 1736 i 1738 roku. U poczЉtkyw nowej sytuacji politycznej w Rzeczypospolitej / H. Palkij. Krakyw : Polska Akademia Umiejкtnoњci, 2000. 257 s.

47. Palkij, H. Giywne kierunki polityki Augusta III wobec Rzeczypospolitej po sejmie pacyfikacyjnym (1736—1740) / H. Palkij // Zeszyty naukowe uniwersytetu Jagiellocskiego, Prace Historyczny. 1998. Z. 125. S. 51—58.

48. Palkij, H. Praca komisji aukcji wojska w latach 1736—1738 / H. Palkij // Kwartalnik Historyczny. 1999. Z. l. S. 19—44.

49. Czeppe, M. Wspyipraca biskupa Kajetana Soityka z kamarylЉ Mniszcha. Pryba charakterystyki / M. Czeppe // Wiek Oњwiecenia. 1993. T. 9. S. 167—173.

50. Czeppe, M. Z dziejyw rywalizacji miкdzy marszaikiem i kanclerzem / M. Czeppe // Trudne stulecie. Studia z dziejyw XVII i XVIII wieku ofiarowane profesorowi Jerzemu Michalskiemu w siedemdziesiЉtЉ rocznicк urodzin / red. J. KЉdzielЉ, W. Kriegseisen, Z. Zielicska, Warszawa, 1994. S. 55—59.

51. Czeppe, M. Dziaialnoњж agenta hetmacskiego w Dreџnie w latach 1752—1756 w њwietle raportyw Andrzeja Protasowicza do Michaia Kazimierza Radziwiiia / M. Czeppe // Studia Historyczne. 1995. Z. 4 (151). S. 495—504.

52. Czeppe, M. Kamaryla pana z Dukli. Ksztaitowanie siк obozu politycznego Jerzego Augusta Mniszcha 1750—1763 / M. Czeppe. Warszawa : Neriton, 1998. 300 s.



53. Ronikier, J. Hetman Adam Sieniawski i jego regimentarze. Studium z historii mentalnoњci szlachty polskiej 1706—1725 / J. Ronikier. Krakyw : Universitas, 1992. 232 s.

54. Sowa, A. Polscy i litewscy ministrowie Augusta II. Pryba porownania / A. Sowa // Sobotka. 1982. Cz. 3—4. S. 449—455.

55. Коњcialkowski, S. Antoni Tyzenhauz: podskarbi nadworny litewski, T. 1 / S. Коњcialkowski. Londyn : Akademia Uniwersyteta Stefana Batorego,1970. 681 s.

56. Staszewski, J. August II Mocny / J. Staszewski. Wrociaw; Warszawa; Krakyw : Ossolineum, 1998. 311 s.

57. Staszewski, J. August III Sas / J. Staszewski. Wrociaw; Warszawa; Krakyw : Ossolineum, 989. 307 s.

58. Staszewski, J. Ostatni «wielki plan» Augusta Mocnego / J. Staszewski // Rocznik Gdacski. 1986. Z. 1. S. 45—67.

59. Staszewski, J. Jak Polskк przemieniж w kraj kwitn№cy... Studia i szkice z czasyw saskich / J. Staszewski. Olsztyn, 1997. 275 s.

60. Staszewski, J. Stanisiaw Leszczycski a tкsknota do kryla-piasta / J. Staszewski // Stanisiaw Leszczycski kryl, polityk, pisarz, mecenas / red. Alojzy Konior. Leszno, 2001. S. 38—52.

61. Staszewski, J. Sejm 1744 roku / J. Staszewski // Parlament, prawo, ludzie. Studia ofiarowane profesorowi Juliuszowi Bardachowi w szeњжdziesiкciolecie pracy twyrczej. Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 1996. S. 273—278.

62. Olszewski, H. Doktryny prawno-ustrojowe czasyw saskich (1697—1740) / H. Olszewski. Warszawa : PWN, 1961. 321 s.

63. Michalski, J. Studia nad reform№ s№downictwa i prawa s№dowego XVIII w. / J. Michalski. Warszawa : Zakiad narodowy imieni Ossolicskich, 1958. 307 s.

64. Anusik, Z. Radziwiiiowie w epoce saskiej. Zarys dziejyw politycznych i maj№tkowych / Z. Anusik, A. Stroynowski // Acta Universitatis Lodziensis. Folia Historica 33. 1989. S. 29—58.

65. Zielicska, Z. Walka «Familii» o reformie Rzeczypospolitej, 1743—1752 / Z. Zielicska. Warszawa : PWN, 1983. 385 s.

66. Markiewicz, M.[Pryby naprawy Rzeczypospolitej. Recenzja] / M. Martkiewicz, H. Palkij // Studia Historyczne. 1986. Z. 1. S. 125—134. Рэц. на кн.: Zielicska, Z. Walka «Familii» o reformie Rzeczypospolitej, 1743—1752. Warszawa : PWN, 1983. 385 s.

67. Zielicska, Z. Mechanizm sejmikowy i klientela radziwiiiowska za Sasyw / Z. Zielicska // Przegl№d Historyczny. 1971. Z. 3. S. 397—410.

68. Zielicska, Z. Studia z dziejyw stosunkyw polsko-rosyjskich w XVIII wieku / Z. Zielicska. Warszawa : Semper, 2001. 255 s.

69. Zielicska, T. Wiкџ rodowa domu Radziwiiiowskiego w њwietle diariusza Michaia Kazimierza Radziwiiia «Rybiecki» / T. Zielicska // Miscellanea Historico-Archivistica. 1989. T. 3. S. 175—190.

70. Zielicska, T. Kariera i upadek їydowskiego potentata w dobrach radziwiiiowskich w XVIII wieku / T. Zielicska // Kwartalnik historyczny. 1991. Z. 3. S. 33—49.

71. Zielicska, T. Feldmarszaiek Jakub Henryk Flemming w њrodowiskach magnatyw polskich / T. Zielicska // Polska-Saksonia w czasach unii (1697—1763). Pryba nowego spyjrzenia / Pod red. K. Bartkiewicza. Zielona Gyra : Lubuskie towarzystwo naukowe, 1998. S. 115—128.

72. Lesicski, J. Spory o dobra neuburskie / J. Lesicski // Miscellanea Historico-Archivistica. 996. T. 6. S. 95—132.

73. Zakrzewski, A. Sejmiki Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego XVI—XVIII w. Ustryj i funkcjonowanie: sejmik trocki / A. Zakrzewski. Warszawa : Liber, 2000. 257 s.

74. Zakrzewski, A. Marszaiek powiatowy Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego marszaikiem sejmikowym (XVI—XVIII w.) / A. Zakrzewski // Parlament, prawo, ludzie. Studia ofiarowane profesorowi Juliuszowi Bardachowi w szeњжdziesieciolecie pracy twyrczej. Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 1996. S. 356—361.

75. Zakrzewski, A. ygraniczenie przez sejmiki Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego monarszego prawa mianowania urzкdnikyw s№dowych, XVII—XVIII w. / A. Zakrzewski // Lietuvos Valstybe XII—XVIII a. Vilnius : Lietuvos istorijos institutas, 1997. S. 173—185.

76. Zakrzewski, A. Kierowanie obradami sejmikyw Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego (XVI—XVIII w.) / A. Zakrzewski // Studia z dziejyw pacstwa i prawa polskiego/ Jydџ; Krakyw : Wydawnictwo Uniwersytetu Jydzkiego, 2000. S. 139—149.

77. Zakrzewski, A. Recepcja ustroju i prawa w Wielkim Ksiкstwie Litewskim, XIV—XVIII wiek / A. Zakrzewski // Studia Juridica. 2002. XL. S. 247—261.



78. Rachuba, A. Wielkie Ksiкstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569—1763 / A. Rachuba. Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 2002. 375 s.

79. Rachuba, A. Sejmiki generalne Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego w Woikowysku i Sionimiu / A. Rachuba // Miкdzy Zachodem a Wschodem. Studia z dziejyw Rzeczypospolitej w epoce nowoїytnej; pod. red. J. Staszewskiego, K. Mikulskiego i J. Dumanowskiego. Toruc : Wydawnictwo Adam Marszaiek, 2002. S. 43—53.

80. Dumin, S. Ciechanoweccy herbu D№browa / S. Dumin, A. Rachuba, J. Sikorska-Kulesza. Warszawa : Wydawnictwo DiG, 1997. 224 s.

81. Lulewicz, H. Urzкdnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego XIV—XVIII wieku / H. Lulewicz, A. Rachuba. Kyrnik: Biblioteka Kyrnicka, 1994. 255 s.

82. Urzкdnicy Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego. Spisy. T. IV. Wojewydztwo smolecskie XIV—XVIII wiek / Opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk. Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2003. 412 s.

83. Urzкdnicy Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego. Spisy. T. 1. Wojewydztwo wilecskie XIV—XVIII wiek / Opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy wspyipracy U. Jemialianczyka i A. Macuka. Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2004. 764 s.

84. Deputaci Trybunaiu Giywnego Wielkiego Ksiкstwa Litewskiego (1697—1794): Spis / pod red. Andrzeja Rachuby; oprac. Andrzej Rachuba i Przemysiaw P. Romaniuk przy wspyipr. Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki; Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. Warszawa : DiG, 2004. 448 s.

85. Kriegseisen, W. Ewangelicy polscy i litewscy w epoce saskiej / W. Kriegseisen. Warszawa : Semper, 1996. 307 s.

86. Kriegseisen, W. Diariusz Petersburskiej podryїy Jana i Piotra Sapiehow z 1726 roku / W. Kriegseisen // Wiek Oswiecenia. 1993. №№ 9. S. 55—63.

87. Karkucicska, W. Anna z Sanguszkyw Radziwiiiowa / W. Karkucicska. Warszawa: Semper, 2000. 391 s.

88. Kosicska, U. Rosyjskie plany wywoiania antykrylewskiej konfederacji i detronizacji Augusta II w 1719 r. / U. Kosicska // Kwartalnik historyczny. 1999. Z. 3. S. 53—75.

89. Kosicska, U. Rosja wobec sejmu jesiennego 1720 r. / U. Kosicska // Kwartalnik historyczny. 2004. Z. 1. S. 39—67.

90. Kosicska, U. Sejm 1719—1720 a sprawa ratyfikacji traktatu wiedecskiego / U. Kosicska. Warszawa : Semper, 2003. 288 s.

91. Kosicska, U. Rokowania Augusta II ze Szwecj№ w latach 1719—1720 / U. Kosicska // Kwartalnik historyczny. 2004. Z. 3. S. 23—44.

92. Ciesielski, T. Zabiegi hetmanyw o rewizjк uchwai sejmu niemego i odzyskanie komendy nad autoramentem cudzoziemskim a sejmy w latach 1717—1724 (prolegomena) / T. Ciesielski // Rzeczpospolita w dobie wielkiej wojny pyinocnej / pod red. Jadwigi Muszycskiej. Kielce, 2001. S. 61—85.

93. Kurek, J. U schyiku panowania Augusta II Sasa / J. Kurek. Katowice : Wydawnictwo Uniwersytetu Њl№skiego, 2003. 222 s.

94. Kurek, J. Parlamentarzyњci za Augusta II i Augusta III Sasyw. Parlamentarzyњci polscy od XVI do XX wieku. Stan badac i postulaty / J. Kurek; red. J. Seredyka, D. Kurpiers-Schreiber. Opole, 1999. S. 35—50.

95. Polski Slownik Biograficzny, T. I—XL. Krakyw; Wrociaw; Warszawa; Krakyw; Gdacsk; Jydџ; Wrociaw, 1935—2006. T. IV, XVIII, XXIII, XXIV, XXVII, XXIX, XXX, XXXV, XL.

96. Achremczyk, S. Obyz stanisiawowski w Prusach Krylewskich w latach 1733—1736 / S. Achremczyk // Rocznik Gdacski. 1986. Z. 1. S. 115—138.

97. Jonasson, G. Szwecja i druga elekcja Stanisiawa Leszczycskiego / G. Jonasson // Rocznik Gdacski. 1986. Z. 1. S. 107—114.

98. Lisek, A. Obyz stanisiawowski w wojewydztwie ruskim w okresie bezkrylewia w 1733 r. i w pierwszych miesi№cach wojny o tron polski / A. Lisek // Rocznik Przemyski. 2000. Z. 4. S. 3—15.

99. Lisek, A. Postawa szlachty ruskiej wobec pryb pacyfikacji kraju w 1735 roku / A. Lisek // Rocznik Przemyski. 2001. Z. 3. S. 33—43.

100. Lisek, A. Uwagi w sprawie orientacji politycznej szlachty cheimskiej w latach (1733—1736) / A. Lisek // Rocznik Przemyski. 2002. Z. 4. S. 65—75.

101. Panek, A. Stanowisko szlachty lubelskiej i jej przywydcyw wobec wojny o tron polski (1733—1735) / A. Panek // Polska-Saksonia w czasach unii (1697—1763). Pryba nowego spojrzenia / Pod red. K. Bartkiewicza. Zielona Gyra : Lubuskie towarzystwo naukowe, 1998. S. 129—146.

102. Dygdaia, J. Obyz saski w Prusach Krylewskich i jego dziaialnoњж w latach 1733—1736 / J. Dygdaia // Rocznik Gdacski. 1986. Z. l. S. 139—166.



103. Dygdaia, J. Dylematy austriackiej polityki wobec Rzeczypospolitej podczas bezkrylewia 1733 roku / J. Dygdaia // Acta Universitatis Nicolai Copernici. 1993. Historia nr XXVIII. S. 103—124.

104. Dygdaia, J. Polityka informacyjna prymasa Teodora Potockiego w bezkrylewiu 1733 roku / J. Dygdaia // Rozprawy z dziejyw XVIII wieku. Z dziejyw komunikacji socjalnej epoki nowoїytnej; pod red. J. Wojtowicza. Toruc, 1993. S. 63—78.

105. Dygdaia, J. Postawa «familii» Czartoryskich w bezkrylewiu 1733 roku z perspektywy Wiednia / J. Dygdaia // Miкdzy wielk№ polityk№ a szlacheckim partykularzem: Studia z dziejyw nowoїytnej Polski i Europy ku czci Profesora Jacka Staszewskiego; red. K. Wajda. Toruc, 1993. S. 275—283.

106. Dygdaia, J. Konfederacja krakowska Teodora Lubomirskiego z pocz№tkyw bezkrylewia 1733 roku a polityka Austrii wobec Rzeczypospolitej / J. Dygdaia // Trudne stulecie. Studia z dziejyw XVII i XVIII wieku ofiarowane profesorowi Jerzemu Michalskiemu w siedemdziesi№t№ rocznicк urodzin; red. J. K№dziela, W. Kriegseisen, Z. Zielicska. Warszawa, 1994. S. 46—54.

107. Dygdaia, J. Kwestia dysydencka w Rzeczypospolitej doby bezkrylewia 1733 roku / J. Dygdaia // Zapiski Historyczne. 1997. T. LXII. S. 45—67.

108. Dygdaia, J. Pakta konwenta Augusta III (z zabiegyw o pozyskanie polskiej opinii szlacheckiej) / J. Dygdaia // Miкdzy Zachodem a wschodem. Studia ku czi profesora Jacka Staszewskiego, T. II; pod red. J. Dumanowskiego, B. Dybasia, K. Mikulskiego, J. Porazinskiego i S. Roszaka. Toruc, 2003. S. 147—157.

109. Dygdaia, J. Saskie pryby infiltracji њrodowisk szlacheckich podczas bezkrylewia 1733 roku / J. Dygdaia // Kwartalnik Historyczny. 2003. Z. 4. S. 47—70.

110. Szklarska, E. Pryby pacyfikacji Rzeczypospolitej w latach 1734—1736. Zabiegi o pozyskanie stronnikyw Leszczycskiego dla obozu Wettyna / E. Szklarska // Rocznik Gdacski. 1986. Z. l. S. 169—180.

111. Szklarska, E. Kwestia wykluczenia cudzoziemca od tronu na sejmie konwokacyjnym 1733 r. / E. Szklarska // Miкdzy Zachodem a wschodem. Studia ku czi profesora Jacka Staszewskiego, T. II; pod red. J. Dumanowskiego, B. Dybasia, K. Mikulskiego, J. Porazinskiego i S. Roszaka. Toruc, 2003. S. 561—573.

112. Szklarska, E. Od centrum ku peryferiom. Konfederacja warszawska jako narzкdzie legitymizacji wiadzy Augusta III / E. Szklarska // Dwyr a kraj. Miкdzy centrum a peryferiami wiadzy; red. R. Skowron. Krakyw, 2003. S. 509—519.

113. Lisek, A. Litwini na sejmie elekcyjnym w 1733 roku / A. Lisek // Z dziejyw XVII i XVIII wieku. Ksiкga jubileuszowa ofiarowana Profesorowi Michaiowi Komaszycskiemu; red. Jan Kwak. Katowice, 1997. S. 138—154.

114. Lisek, A. Postawa Radziwiiiyw w okresie przedostatniego bezkrylewia i w pierwszych miesi№cach wojny domowej (1733—1734) / A. Lisek // Radziwiiiowie. Obrazy literackie. Biografie. Њwiadectwa historyczne; pod red. K. Stкpnika. Lublin, 2003. S. 358—370.

## SUMMARY

The article analyses the polish historiography of internal political position in the Grand Duchy of Lithuania in 1717—1763. Stages of the development of the polish historiography are picked out and characteristics of the main historical schools are made. Polish historians' researches are analyzed here. The History of Rzecz Pospolita is studied by Wroclaw, Warsaw, Katowice, Krakyw and Toruc historical schools. The most scale studies of the epoch mastery Vetins in Rzecz Pospolita are conducted in Krakow. However, history of the Grand Duchy of Lithuania in 1717—1763 are studied by Warsaw historical school most of all. Certain increase to interests of the polish researchers in history of Rzecz Pospolita «Sass period» has occurred last years. At that time it is necessary to pay attention that studies of polish historians are have uneven chronological nature. Some problems are not studied at all, but on others are written quite a few monographs and articles (for instance, events of without-king's period in 1733, Sejm in 1744).